циплине. Следовательно, организуя внешние воздействия, необходимо в каждом конкретном случае определять, обладает ли данный студент низкой умственной активностью или нежеланием ее приложения к процессу овладения иностранным языком. В зависимости от этого обучающий подход может быть направлен либо на развитие умственной активности, либо на повышение интереса к иностранному языку, который направит имеющуюся у студента умственную активность на овладение данным учебным предметом.

*Л.Б. Мусіч*
*БДЭУ (Минск)*

## ЛІБЕРАЛЬНЫЯ ІДЭІ БЕЛАРУСКІХ (ЛІЦВІНСКІХ) ФІЗІЯКРАТАЎ І ІХ ЗНАЧЭННЕ ДЛЯ РЫНКАВАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ ЭКАНОМІКІ БЕЛАРУСІ

Гісторыя эканамічнага і культурнага развіцця беларускіх (ліцвінскіх) земляў у часы Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) характарызавалася інтэнсіўнымі адносінамі з перадавымі краінамі Еўропы, найбольш высокаразвітага ў той час рэгіёнаў свету. Вось толькі некаторыя словы — "сведкі" гэтага працэсу: *гандаль, гешэфт, ярмарка, дах, грунт, пляц* — з нямецкай мовы; *грошы* ( denarins grossns ), *гарбата* (herba) — з латыні; *фатэль* (кресло), *разынкі* (изюм) — з французкай; *файна* — з англійскай. Развіццё рынкавых адносін суправаджалася распаўсюджваннем у ВКЛ ідэй фізіякратаў. Так, епіскап І.Я. Масальскі (1729–1794), доктар філасофіі і тэалогіі, першы старшыня Адукацыйнай камісіі, уваходзіў у парыжскі кружок фізіякратаў, часта наведваў салоны энцыклапедыстаў. Па яго ініцыятыве ў ВКЛ быў запрошаны фізіякрат Бадо. Пад уплывам Масальскага пры Віленскім універсітэце функцыянаваў кружок прагрэсіўных дзеячаў, якія цікавіліся эканамічнымі пытаннямі. Тыповыя для фізіякратаў погляды мелі І.Страйноўскі (1752–1815), К.Нарбут (1738–1807), І.Храптовіч (1729–1812), М.Вольскі (1762–1803), А.Нарушэвіч (1733–1796), С.Аскерка (нарадз. у 1712 г.), А.Тызенгаўз (1733–1785).

Ліцвінскія фізіякраты асноўнай крыніцай матэрыяльнага багацця лічылі сельскагаспадарчую працу. Таму для росту дабрабыту ў краіне трэба было стварыць добрыя ўмовы для працы земляробаў: багаты селянін — багатая краіна. І.Страйноўскі, М.Вольскі, С. Аскерка распрацавалі сістэму патрэбаў чалавека, выдзяляючы першачарговыя — у ежы, адзенні і інш., патрэбы ў самазахаванні і бяспецы асобы, падкрэслівалі неабходнасць развіцця патрэбы у павелічэнні багацця, што стымулявала б працоўную ініцыятыву людзей патрэбы ў развіцці асобы чалавека. Сістэму чалавечых патрэбаў і магчымасці грамадства для іх задавальнення М.Вольскі лічыў зыходным момантам і важнейшым зместам гістарычнага развіцця.

Сам тэрмін «фізіякраты» азначае «ўлада прыроды». Грамадства імі разглядалася як складаны арганізм-частка прыроднага, у якім і дзейнічае чалавек. Беларускія фізіякраты, як і іх аднадумцы-французы, развівалі ідэі натуральнага парадку, натуральных законаў функцыянавання прыроды і грамадства як яе састаўной часткі. Яны падкрэслівалі важнасць асабістай свабоды, прыватнай ініцыятывы і прыватнай уласнасці. Рэалізацыя гэтых прынцыпаў у найбольшай ступені адпавядае патрэбам і аб'ектыўным памкненням людзей і вызначае іх паводзіны і магчымасць дасягнення поспеху. Пазбаўлены свабоды і ўласнасці, чалавек не можа прынесці карысці ні сабе, ні грамадству. Вельмі добра аб гэтым, значна пазней, пісаў П. Сталыпін: «Природа вложила в человека некоторые врожденные инстинкты, как-то: чувство голода, половое чувство и т.п. — и одно из самых сильных чувств этого порядка — чувство собственности... Искусственное в этом отношении оскопление нашего крестьянина, уничтожение в нем врожденного чувства собственности ведет ко многому дурному и, главное, к бедности. А бедность, по мне, худшее из рабств» (Цыт. па: *В Хотулев*. П. Столыпин. М., 1998. С. 240).

Амаль усе беларускія фізіякраты падкрэслівалі ролю розуму ў грамадскім прагрэсе, былі прыхільнікамі ідэй асветніцтва. У практычнай дзейнасці яны актыўна рэалізоўвалі свае канцэпцыі. Фактычна фізіякраты ў свой час былі ідэолагамі буржуазных рэвалюцый.

Погляды фізіякратаў-прыхільнікаў эканамічнага лібералізму захоўваюць актуальнасць для рынкавай эканомікі. Агульнавядомая фраза, што рынкавая эканоміка, як і палітычная дэмакратыя, маюць шмат недахопаў, але лепшага чалавецтва пакуль што не прыдумала. Мінулае 10-годдзе, мяжа стагоддзяў і тысячагоддзяў, адзначана пераходам мноства краінаў ад каманднай да рынкавай эканомікі і адраджэннем на гэтай прасторы ідэяў эканамічнага лібераліму, характэрнага для фізіякратаў. Гістарычны вопыт яскрава прадэманстрававаў, што камандная сістэма, з дзяржаўнай ўласнасцю амаль на ўсе віды рэсурсаў, не ў стане забяспечыць эканамічную эфектыўнасць, бо не можа стварыць спрыяльных умоў для рэалізацыі асабітых эканамічных інтарэсаў і канкурэнцыі ў сферы вытворчасці тавараў і паслугаў, гэтых двух асноўных рухавікоў эканамічнага развіцця. Паступова дадзеная ідэя асэнсоўваецца і ў Беларусі.

Аб'ектыўная неабходнасць рынкавай трансфармацыі эканомікі рэалізуецца з рознай ступенню хуткасці на постсавецкай (постсацыялістычнай) прасторы. Прэм'ер-міністр Эстоніі Март Лаар, напрыклад, адзначае "радыкальна рашучыя" дзеянні па рэфармаванню эканомікі сваей краіны. У выніку ў Эстоніі пануе прыватны сектар, у сельскай гаспадарцы няма ніводнага калгаса — працуюць фермеры ці аб'яднанні сельгасвытворцаў. "Адзіная роля дзяржавы ў эканоміцы, і гэта маё перакананне, — кажа Март Лаар, — ствараць умовы для прыватнага бізнэсу" ("Народная воля. 2001. 7 лют.). Вынікам радыкальных рэформаў і эканамічнага лібералізму стала ўваходжанне Эстоніі — першай з былых рэспублік СССР — у 2000 г., упершыню, па важнейшых эканамічных паказчыках, у спіс развітых у эканамічных адносінах краін. Прыклад славянскіх Чэхіі, Польшчы, Славеніі і іншых дзяржаў, таксама дэманструе хуткі ўздым эканамічнай эфектыўнасці і дабрабыту насельніцтва. Падняўшыся на адну прыступку ў сваім развіцці, чэхі, палякі і іншыя народы тут жа ствараюць сабе новыя "складанасці", ставячы задачу уваходжання ў Еўрапейскі саюз, што вымагае далейшай рацыянальнасці эканамічнай сістэмы.

Урад Беларусі чамусьці не спяшаецца з эканамічнамі рэформамі, аб'ектыўная неабходнасць якіх захоўвае сваю ак-

туальнасць. Сусветны вопыт прадэманстраваў эфектыўнасць ідэяў laissez faire, іншых эканамічных свабод, важнасць такіх правоў, як права на прыватную ўласнасць, у тым ліку на зямлю. Таму было б рацыянальным у нашай краіне паскорыць рынкавую трансфармацыю эканомікі. Ліберальныя эканамічныя рэформы, з абавязковай канкурэнцыяй, падштурхнулі б прагрэсіўныя змены і ў іншых сферах.

Пытанняў і праблем шмат. Іх разуменне і адэкватнае вырашэнне, з улікам пазітыўнага сусветнага вопыту, павысіла б рэйтынг Беларусі на сусветнай арэне. Выкарыстанне тэарытычных напрацовак беларускіх фізіякратаў магло памагчы гэтаму працэсу.

***Т.И. Повалихина***
*БГЭУ (Минск)*

## ПРОБЛЕМЫ МЕЖДУНАРОДНОГО КРЕДИТОВАНИЯ И МЕЖДУНАРОДНОЙ ЗАДОЛЖЕННОСТИ В 20-Е ГГ. XX В.

Первая мировая война оказала разрушительное влияние на структуру и характер системы международного кредитования и заимствования. Во-первых, она создала проблему новых международных долгов в форме военных займов и репараций. Во-вторых, статус Западной Европы как международного кредитора значительно пошатнулся. Большинство европейских государств были вынуждены отозвать значительную часть своих заграничных активов, чтобы финансировать военные расходы. Германия лишилась свыше 80 % своих зарубежных активов, Франция — более половины, а Великобритания — около 15 %.

В отличие от них США стали чистым нетто-кредитором: сумма их долгосрочных кредитов составляла 3,3 млрд долларов в то время как до войны они были должником европейских государств примерно на ту же сумму.

Наиболее сложной проблемой, требующей координации межгосударственной политики в 20-е гг., была проблема межсозных долгов и репараций. В той или иной степени она